# АБ «СТРАТЭГІЧНЫМ КУРСЕ» РАСЕЙСКАЙ ФЭДЭРАЦЫІ І АБАРОНЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ІНТАРЭСАЎ БЕЛАРУСІ

## ЗАЯВА СОЙМУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

Яшчэ 14 верасьня 1995 г. прэзідэнт Расейскай Федэрацыі Б.Ельцын падпісаў указ N 940 «Аб зацьверджаньні Стратэгічнага курсу Расейскай Федэрацыі з дзяржавамі - удзельніцамі Садружнасьці Незалежных Дзяржаў». Гэты дакумант расейскія ўлады не афішавалі, але ён усё ж быў апублікаваны ў беларускай і ўкраінскай незалежнай прэсе.

У тэксьце дакуманту, у прыватнасьці, гаворыцца:«...На тэрыторыі СНД засяроджаныя нашыя галоўныя жацьцёвыя інтарэсы ў галіне эканомікі, абароны, бясьпекі, абароны правоў расіянаў, забясьпечваньне якіх складае аснову нацыянальнай бясьпекі краіны» (п.1). Тэрыторыі дзяржаваў СНД адкрыта называюцца «зонай інтарэсаў Расеі» (п.14). Ставіцца задача ўмацаваць Расею ў якасьці «вядучай сілы» ў рэгіёне (п.4), для чаго плануецца зацягнуць постсавецкія дзяржавы ў палітычнае аб'яднаньне (п.1.2) і «абаронны саюз» (п.12), дамагчыся аховы «межаў па перыметры СНД ... супольнымі намаганьнямі» (п.13), захоўваць вядучае становішча Расеі на рынках СНД» (п. 19),ажыцявіць інфармацыйную экспансію Расеі ў краіны СНД (п. 15) і г.д.

«Стратэгічны курс» - гэта курс экспансіі, гэта шырокая праграма забесьпячэньня панаваньня Расеі ў рэгіёне і падначаленьня ўсёй дзейнасьці дзяржаваў СНД інтарэсам Расеі. Гэты дзяржаўны акт перакрэсьлівае самыя кволыя спадзяваньні на тое, што СНД зможа функцыянаваць менавіта, як садружнасьць, г.зн. орган каардынацыі дзейнасьці раўнапраўных суб'ектаў. Наадварот, рэалізацыя дактрыны»стратэгічнага курсу» на практыцы азначала б адсоўваньне іншых дзяржаваў СНД зь міжнароднай арэны як самастойных суб'ектаў.

Выказваньні і справы расейскага кіраўніцтва - нядоўгія словы віцэ-прэм'ера А.Бальшакова пра тое, што Расея нясе «адказнасьць» за краіны СНД, імкненьне завалодаць маёмасьцю (інфраструктураю, нафтагазавым комплексам) на тэрыторыі постсавецкіх дзяржаваў, зацягваньне краін СНД у сістэму «калектыўнай бясьпекі», што зноў апынулася на парадку дня, - усё гэта сьведчаць, што «дактрына» пачала рэалізавацца. А чачэнскія падзеі паказваюць усяму сьвету, як разумее афіцыйная Масква «адказнасьць» за тыя, ці іншыя тэрыторыі.